**ДАНІЛОВІЧ МІКАЛАЙ АЛЯКСАНДРАВІЧ** (н. 21.10.1955, в. Бабіна Гродз. р-на), беларускі лінгвіст і педагог. Д-р філал. н. (2004), прафесар (2006). Закончыў філалагічны факультэт Гродзенскага педінстытута імя Янкі Купалы (1977) і аспірантуру пры кафедры беларускай мовы МДПІ імя А.М.Горкага (1979). Выкладаў беларускую мову ў ГрДУ (з 1984), з'яўляўся вядучым навуковым супрацоўнікам навукова-даследчага сектара ўніверсітэта (1999 – 2001). З 2005 г. – прафесар кафедры беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства, з 2007 г. – загадчык гэтай кафедры. Кандыдацкая дысертацыя прысвечана граматычнай характарыстыцы фразеалагізмаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы, доктарская – тыпалогіі і лексічнаму складу беларускай дыялектнай фразеалогіі. Спецыяліст у галіне лексікалогіі, фразеалогіі, дыялекталогіі, лінгвадыдактыкі, лінгвістычнага краязнаўства. Распрацаваў тэорыю фразеалагічных часцін мовы, заснаваў новы навуковы напрамак у нацыянальнай лінгвістыцы – фразеалогію беларускай дыялектнай мовы.

*Тв.*: Граматычная характарыстыка фразеалагізмаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы: манагр. Мн., 1991; Вывучэнне фразеалогіі на ўроках мовы: дапам. Мн., 1991; Беларуская дыялекталогія: практыкум. Гродна, 1995; Слоўнік рэгіянальнай лексікі Гродзеншчыны / пад рэд. М.А.Даніловіча, П.У.Сцяцко. Гродна, 1999; Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны. Гродна, 2000; Беларуская дыялектная фразеалогія і яе лексічная аснова: манагр. Гродна, 2003; Дыялектная мова Гродзеншчыны: хрэстам. Гродна, 2007 (у суаўт.); Лінгвістычнае краязнаўства Гродзеншчыны: дапам. Гродна, 2008.

*Д.В.Дзятко*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ